# Абагульненне па раздзеле «Беларусь і свет у другой палове 1940-х гг. — пачатку 1990-х гг.»

## Працуем з паняццямі

**1.** Вывучыце прапанаваны пералік паняццяў і падзяліце іх на групы. Крытэрыі падзелу вызначце самастойна.

*Біпалярны свет, глабалізацыя, дэкаланізацыя, інтэграцыя, інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі, інфармацыйнае грамадства, мадэрнізацыя, меліярацыя, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, навукова-тэхнічны прагрэс, неакансерватызм, перабудова, постіндустрыяльнае грамадства, «халодная вайна», эканамічная рэформа, экстэнсіўны шлях развіцця эканомікі.*

**2.** Вызначце паняцці, якія адносяцца да гісторыі Беларусі. Канкрэтызуйце іх прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з’яў, працэсаў).

## Аналізуем, тлумачым, разважаем

**3.** Выявіце ўзаемасувязь паміж наступнымі гістарычнымі фактамі:

А. Другая сусветная вайна — «халодная вайна».
Б. Другая сусветная вайна — дэкаланізацыя.
В. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя — глабалізацыя.
Г. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя — постіндустрыяльнае грамадства.
Д. Глабалізацыя — пагроза нацыянальнаму суверэнітэту дзяржаў.

**4.** Дакажыце або абвергніце наступныя тэзісы:

А. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны сфарміраваўся двухполюсны свет.
Б. Пасля Другой сусветнай вайны ў Азіі і Афрыцы адбываўся актыўны працэс дэкаланізацыі.
В. У другой палове XX ст. актывізаваліся інтэграцыйныя працэсы ў Заходняй Еўропе.

Г. 1945–1991 гг. у гісторыі БССР зрабіліся перыядам мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі і прамысловасці, стварэння новых галін эканомікі, вялікіх дасягненняў у сацыяльнай сферы, навуцы і культуры.

Д. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя прывяла да змянення месца і ролі БССР у народнагаспадарчым комплексе СССР.

Е. 1950–1970-я гг. былі часам росквіту беларускага манументальнага мастацтва.

## Сістэматызуем веды

**5.** Выкарыстоўваючы стужку часу, прадстаўленую ў пачатку раздзела III, выканайце наступныя заданні.

А. Якімі падзеямі / з'явамі / працэсамі вы б дапоўнілі стужку часу? Чаму?

Б. Прапануйце форму для іх абазначэння (карціна, картасхема, цытата, фотаздымак і інш.).

В. Прадстаўце развіццё Беларусі ў другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг. у выглядзе лагічнай схемы (ментальнай карты). Адлюструйце ў ёй эканамічнае, палітычнае, сацыяльнае і духоўнае развіццё рэспублікі ў названы перыяд.

**6.** Работа ў міні-групах. Складзіце топ-10 дасягненняў БССР у другой палове 1940-х — пачатку 1990-х гг. Як яны змянілі жыццё беларускага грамадства? Якія сацыяльныя, эканамічныя і культурныя заваёвы вывучанага перыяду Беларусь захоўвае сёння?

## Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

**7.** Разгледзьце картасхемы (гл. с. 167–168). На аснове іх складзіце тэзісы для адказу на пытанне: «Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у 1944–1964 гг.».

БССР у другой палове 1940-х — першай палове 1950-х гг.



## Найважнейшыя аб'екты прамысловасці, транспарту, навукі, адукацыі і сродкаў інфармацыі, створаныя ў БССР у 1955—1964 гг.




### Вытворчасць

- грузавых аўтамабіляў
- кар'ерных самазвалаў (вытворчасць пераведзена з Мінска)
- камплектуючых для аўтамабіле- і трактарабудавання
- шматколавых цягачоў
- сельскагаспадарчых машын
- меліярацыйных машын
- суднаў
- рухавікоў унутранага згарання
- станкоў
- ліфтоў
- вымяральных прылад
- электронных вылічальных машын
- радыёдэталей
- электратэхнічных вырабаў
- халадзільнікаў
- газавых пліт
- гадзіннікаў
- пластмасавых і гумавых вырабаў
- мінеральных угнаенняў
- шкловалакна

Нафтаперапрацоўчы завод

Першы газаправод (1960)

Інстытуты (ВНУ)
- медыцынскі
- радыётэхнічны
- машынабудаўнічы